6. Документы внешней политики СССР. Т. 22. Кн. 2. 1 сентября – 31 декабря 1939 г. – М. : Международные отношения, 1992. – 688 с.

7. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зб. дакум. і матэр. У 4 т. Т. 3. 1 верасня 1939 г. – 3 ліпеня 1944 г. – Мінск : Юніпак, 2010. – С. 440.

8. Басюк, І. “Вялікім” закон не пісаны. Беларусь у планах пакта Рыбентропа-Молатава / І. Басюк // Беларуская думка. – 1994. – № 2. – С. 64–65.

9. Беларуская нацыя: уз’яднанне. Верасень 1939 г. – чэрвень 1941 г. : зб. дакум. і матэр. ; аўт.-уклад. У. Ф. Ладысёў. – Мінск : БДУ, 2004. – С. 199.

10. Прибылов, В. И. «Захват» или «воссоединение»? / В.И. Прибылов // Военно-исторический журнал. – 1990. – № 10. – С. 13–23.

11. Семиряга, М. И. 17 сентября 1939 / М. И. Семиряга // Советское славяноведение. – 1990. – № 5. – С. 3–16.

12. “Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…” Верасень 1939–1956 гг. : дакум. і матэр. У 2 кн. Кн. 1. Верасень 1939 г. – 1941 г. – Мінск : Беларуская навука, 2009. – 339 с.

13. Мацко, А. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР – акт гістарычнай справядлівасці / А. Мацко, С. Кабяк. – Мінск : Веды, 1989. – 25 с.

14. Парсаданова, В. С. Депортация населения из Западной Украины и Западной Белоруссии в 1939–1941 гг. / В. С. Парсаданова // Новая и новейшая история. – 1989. – № 2. – С. 27–37.

15. Хацкевіч, А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939–1941 гг.) / А. Хацкевіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 2. – С. 70–76.

УДК 930(47+57)"1939-1941":94(100)"1939":94(476)"1939":94(477)"1939"

**М. М. Мязга**

*ГДУ імя. Ф. Скарыны, г. Гомель*

# ПАЧАТАК ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ЎЗ’ЯДНАННЕ БЕЛАРУСКАГА І ЎКРАІНСКАГА НАРОДАЎ У МЕЖАХ БССР І УССР У АДЛЮСТРАВАННІ САВЕЦКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1939–1941 ГАДОЎ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*У артыкуле ахарактарызаваны змест савецкай гістарыяграфіі 1939–1941 гг. па праблеме пачатку Другой сусветнай вайны і ўз’яднання беларускага і ўкраінскага народаў у межах адной дзяржавы. Паказана, што вывучэнне ўказаннай праблемы адбывалася ў спецыфічных палітычных умовах, якія аказвалі вызначальны ўплыў на змест гістарыяграфічных палажэнняў і канцэпцый, якія былі распрацаваны савецкімі даследчыкамі ў той час. Яны зводзіліся да абгрунтавання і апраўдання савецкай палітыкі па ўключэнню тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад СССР.*

Пачатак Другой сусветнай вайны выклікаў істотныя геапалітычныя перамены ва Усходняй Еўропе. Яны закранулі і лёс беларускага і ўкраінскага народаў. Адбылося аб’яднанне асноўнай масы іх этнічных тэрыторый у межах Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны. Гэтыя працэсы знайшлі прыкметнае месца ў савецкай гістарыяграфіі. Прычым ў ёй можна ў якасці асобнага выдзеліць невялікі храналагічны перыяд 1939–1941 гг. Своеасаблівасць яго заключаецца ў тым, што савецкія гісторыкі ў сваіх ацэнках адштурхоўваліся ад той палітычнай лініі, якую праводзіла кіраўніцтва краіны пасля падпісання савецка-германскага дагавора аб ненападзенні. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ацэнкі савецкіх гісторыкаў адносна падзей пачатковага этапа Другой сусветнай вайны істотна памяняюцца і можна казаць пра пачатак новага этапу ў развіцці гістарыяграфіі ўказанай праблемы.

Падпісанне пакта Рібентропа – Молатава, пасля якога назіраецца палітычнае збліжэнне СССР з Германіяй і адбыўся падзел Польшчы названымі краінамі, прывяло да перабудовы зместу савецкай гістарыяграфіі па пытаннях польска-савецкіх адносін і ўзнікнення Другой сусветнай вайны. У гістарычных творах савецкіх аўтараў рэзка ўзмацнілася негатыўная ацэнка знешняй палітыкі Польшчы. У. Пічэта ў сваіх даследаваннях робіць Польшчу краінай, якая развязала Другую сусветную вайну: «… польскія кіраўнікі пачалі вайну супраць Германіі» [1, с. 126]. І. Лочмель таксама высунуў супраць Польшчы абвінавачванне ў развязванні вайны с Германіяй. Ён пісаў, што польскія кіраўнікі па ўказанню Англіі і Францыі ўвязаліся ў гэтую вайну [2, с. 153]. Далей ён імкнецца апраўдаць уступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Згодна з яго канцэпцыяй, народы гэтых тэрыторый былі кінуты на волю лёсу польскім урадам, паднялі паўстанне супраць акупантаў і чакалі дапамогі ад савецкай краіны [3, с. 288–289]. Тэзіс аб паўстанні рабочых і сялян Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны быў узяты савецкай гістарыяграфіяй з афіцыйнага абгрунтавання савецкім кіраўніцтвам уступлення Чырвонай Арміі на

тэрыторыю Польшчы. У загадзе камандуючага Беларускім фронтам аб пачатку наступлення гаварылася аб неабходнасці садзейнічаць паўстаўшым рабочым і сялянам Заходняй Беларусі [4, с. 36].

Савецкія гісторыкі шмат пісалі аб «ваганнях» польскай палітыкі напярэдадні Другой сусветнай вайны. Яны тлумачыліся імкненнем правячых колаў гэтай краіны знайсці саюзніка для ажыццяўлення сваіх антысавецкіх планаў. Спачатку яны мелі намер выкарыстаць у інтарэсах сваёй антысавецкай палітыкі Германію. Але, «калі стала відавочна, што Германія не хоча для іншых цягаць каштаны з агню, Польшча знов перамятнулася на бок Францыі і Англіі». Пачатак польска-германскай вайны тлумачыўся ў адпаведнасці з палітычнай лініяй савецкага кіраўніцтва пасля падпісання пакта Рыбентропа – Молатава. Адзначалася, што Англія і Францыя, якія імкнуліся сарваць наладжванне савецка-германскіх адносін, падштурхнулі Польшчу да вайны з Германіяй [5, с. 42–43]. Безумона, палажэнні савецкай гістарыяграфіі аб вядучай ролі Польшчы ў развязванні Другой сусветнай вайны не вытрымліваюць ніякай навуковай крытыкі. Яны былі пароджаны выключна палітычнай кан’юнктурай і гістарычнай палітыкай савецкай дзяржавы.

Пасля падзей верасня 1939 г. узрасла актыўнасць савецкай гістарыяграфіі ў справе вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, што звязана з атрыманнем адпаведных прамых дырэктыў ад савецкіх і партыйных органаў [6, с. 9–10]. 28 верасня – 11 кастрычніка 1939 г. у Інстытуце гісторыі Украіны Акадэміі навук УССР быў прачытаны цыкл навукова-папулярных дакладаў, якія былі прысвечаны гісторыі Заходняй Украіны. В 1940 г. на іх аснове быў выдадзены зборнік артыкулаў. Дадзеная кніга мела, перш за ўсё, прапагандысцкі характар, уключала ў якасці дадатку шэраг дакументаў, якія характарызавалі палітыку савецкай улады ў адносінах да Заходняй Украіны [7, с. 112].

Савецкая гістарычная перыёдыка адрэагавала на далучэнне да СССР Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны шматлікімі публікацыямі. Сучасны расійскі даследчык А. П. Аксёнава адзначае, што ў концы 1939–1940 году гэтая тэма не сходзіла са старонак часопіса «Савецкая навука» [8, с. 192]. А. І. Алаторцава паказала ў сваіх даследаваннях, што на далучэнне да СССР Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны актыўна адгукнуўся, у прыватнасці, часопіс «Гісторык-марксіст» [9, с. 67].

Пры вывучэнні польскай палітыкі ў дачыненні да Заходняй Беларусі савецкая гістарыяграфія працягвала рабіць акцэнт на такія ж аспекты, як нацыянальны і сацыяльны прыгнёт. Крытыка польскай

палітыкі ў дачыненні да «ўсходніх крэсаў» павінна была паказаць абгрунтаванасць уступлення Чырвонай Арміі на тэрыторую Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Прыкладам можа служыць калектыўнае выданне «Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне». У ім прама сказана: «Аўтары гэтай кнігі ставілі сваёй мэтаю паказаць змрочнае і пакутлівае жыццё працоўных Заходняй Беларусі ў перыяд панавання польскіх памешчыкаў і капіталістаў, гераічную барацьбу беларускага народа супраць сваіх прыгнятальнікаў» [10, с. 3]. У працы «Заходняя Украіна» яе аўтары адзначаюць малазямелле і беззямелле асноўнай масы ўкраінскага сялянства на тэрыторыі Польшчы. Выкліканае такім становішчам паўстанне сялян польскі ўрад у 1930 г. «патапіў у крыві» [11, с. 28, 30]. Пасля вераснёўскіх падзей 1939 г. з’яўляецца маса работ савецкіх гісторыкаў, аўтары якіх імкнуліся паказаць негатыўныя эканамічныя наступствы польскага панавання на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Гэта быў аргумент на карысць абгрунтавання ўключэння названых тэрыторый у склад СССР.

Яшчэ адным аргументам такога кшталту становяцца «гістарычныя правы» СССР на названыя тэрыторыі і этнічная аднароднасць іх насельніцтва з насельніцтвам адпаведных савецкіх рэспублік. Як адзначае сучасны расійскі гісторык А. М. Дуброўскі, у сярэдзіне 1930-х гадоў ва ўмовах нарастання пагрозы новай вайны савецкае кіраўніцтва ўсвядоміла слабасць сацыялістычных ідэалаў у якасці мабілізуючай сілы пры абароне СССР і таму вырашыла абаперціся яшчэ і на традыцыйныя каштоўнасці расійскай дзяржаўнасці. Ва ўмовах нарастання пагрозы вайны ў ідэалогіі бальшавікоў усё большую ролю адыгрывалі нацыянальна-дзяржаўныя тэндэнцыі. Гістарычная навука і гістарычная адукацыя павінны былі стаць эфектыўным сродкам іх фармавання, а таксама выхавання ў савецкіх людзей пачуцця патрыятызму [12, с. 93–95]. У. Пічэта пісаў у сувязі з гэтым, што «Заходняя Украіна… і Заходняя Беларусь… – гэта спрадвечна рускія землі, якія ўваходзілі ў «імперыю Рурыкавічаў». У этнічных адносінах іх насельніцтва складала адзінае цэлае з астатнімі ўсходнеславянскімі плямёнамі». Ён лічыў, што 70 % насельніцтва Заходняй Украіны – украінцы, а ў Заходняй Беларусі палякаў налічваецца толькі 2,5–5 % [1, с. 3, 126]. У яшчэ адным сваім артыкуле У. Пічэта спачатку робіць гістарычны экскурс, пачынаючы яго з эпохі Галіцка-Валынскага княства і Вялікага княства Літоўскага, і паказвае, што на працягу ўсёй сваёй гісторыі ўкраінскі і беларускі народы змагаліся супраць «экспансіі польскіх паноў». Далей ён адзначае, што пасля заканчэння Першай сусветнай вайны «англа-французскія імперыялісты стварылі панскую Польшчу як фарпост барацьбы супраць маладой Савецкай Расіі», і ў выніку прадпрынятага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«польскімі панамі» пры падтрымцы Антанты паходу супраць Савецкай Расіі ім удалося захапіць Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Далей аўтар падвяргаў рэзкай крытыцы палітыку Польшчы на заходнебеларускіх и заходнеўкраінскіх землях, якія «для польскіх паноў … былі не чым іншым, як калоніямі». Са зместу артыкула напрошваецца выснова, якую і фармулюе У. Пічэта: «Натуральна, што стагнаўшыя пад панскім гнётам беларускія і ўкраінскія народныя масы з надзеяй глядзелі на ўсход, у бок магутнага Савецкага Саюза, чакаючы ад яго дапамогі», якую і аказала Чырвоная Армія 17 верасня 1939 г. [13, с. 94, 95, 98].

Д. Мін у сваёй рабоце імкнецца даказаць, што Заходняя Украіна – гэта «спрадвечна руская зямля», якая з часоў Кіеўскай Русі вяла барацьбу супраць польскай агрэсіі. Польшчу, якая адрадзілася ў 1918 г., ён характарызует як «ласкутнае» дзяржаўнае ўтварэнне, «якое разбухла за кошт рабавання чужых тэрыторый». Антанта стварала яго «як шчыт супраць Германіі, і главное, як плацдарм для нападу на … СССР. З санкцыі Антанты польскія захопнікі ператварылі Заходнюю Украіну ў сваю калонію» [14, с. 4–5, 11]. Далей названы аўтар абвінавачвае польскі ўрад у тым, што ён уверг сваю «краіну в бездань вайны» і кінуў народ Заходняй Украіны на волю лёсу. У такой сітуацыі ўкраінцы ў Заходняй Украіне ўзнялі паўстанне, і ў склаўшайся сітуацыі СССР павінен быў прыйсці на дапамогу «аднакроўным братам украінцам і беларусам, якія жылі ў панскай Польшчы» [14, с. 44–45].

Ва ўжо ўзгадваўшайся рабоце «Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне» заяўляецца аб развале польскай дзяржавы пад ударамі германскай арміі. Калі гэта адбылося, то СССР не змог заставацца абыякавым да лёсу «аднакроўных братоў беларусаў і ўкраінцаў. Савецкі ўрад прыняў гістарычнае рашэнне: падаць руку дапамогі сваім братам – беларусам і ўкраінцам, якія насялялі Польшчу» [10, с. 74]. М. Пятроўскі пісаў аб «польскай акупацыі» Заходняй Украіны, ва ўмовах якой панавала польскае памешчыцкае землеўладанне і насаджалася асадніцтва, прыходзіла да заняпаду ўкраінская культура. Ён абвінаваціў польскі ўрад у тым, што ён у перадваенныя гады «дапамог Гітлеру ў яго мярзотнай антысавецкай гульні» і не падрыхтаваў краіну да абароны. Калі польскі ўрад «збег, кінуў краіну на волю лёсу, савецкі ўрад не мог заставацца пабочным наглядальнікам, і Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі і «вызваліла сваіх аднакроўных братоў – украінцаў і беларусаў» [15, с. 30–31, 32]. Тэзіс аб крушэнні польскай дзяржавы гучыць і артыкуле А. Паўлава [16]. Ю. Дашкевіч у чарговы раз абгрунтоўвае паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну неабходнасцю вызваліць «аднакроўных братоў»

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

[17]. У рабоце «Заходняя Украіна» адзначаецца, што польска-германская вайна паказала «ўсю ўнутраную нетрываласць і гніласць штучна створанай ласкутнай дзяржавы панскай Польшчы». Польскія правячыя колы абвінавачваюцца ў тым, што менавіта яны ўцягнулі свой народ у вайну з Германіяй: «… натраўліваемая англа-французскімі імперыялістамі, Польшча пачала вайну з Германіяй» [11, с. 97, 99].

У канцы 1939 г. у «Гістарычным часопісе» быў апублікаваны артыкул А. Манусевіча «Гістарычныя перадумовы краху Польшчы». Артыкул быў напісаны ў рэчашчы тагачаснай савецкай знешняй палітыкі і накіраваны супраць Польшчы і дэмакратычных краін Заходняй Еўропы. «Банкруцтва» польскай дзяржавы аўтар названага артыкула звязваў з крахам Версальскай сістэмы міжнародных адносін у цэлым. Польшча характарызавалася як штучная і часовая дзяржава. Ён лічыў, што пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Польшчы не абавязкова трэба было выкарыстоўваць права на аддзяленне. Польская дзяржава разглядалася ў артыкуле як буферная, а лозунг «Польшчы ад мора да мора» не столькі як польскі, колькі як антантаўскі. Да краху Польшчу прывялі ўнутраныя супярэчнасці, «авантурыстычная знешняя і ўнутраная палітыка» [18, с. 63, 69].

У часопісе «Веснік Акадэміі навук СССР» быў надрукаваны артыкул акадэміка І. Трайніна «Нацыянальнае вызваленне Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі». Названы аўтар падкрэсліваў, што з пачаткам у 1939 г. польска-германскай вайны дагаворы СССР з былым польскім урадам страцілі сваё значэнне. Пры гэтым адзначалася, што Польшча не выканала сваіх абавязацельстваў у адносінах да беларусаў і ўкраінцаў, а развал Польшчы стварыў пагрозу для лёсу «брацкіх народаў», да чаго СССР не мог заставацца абыякавым. Таму «Чырвоная Армія перайшла граніцу і ўзяла іх пад сваю абарону» [8, с. 188]. І. Трайнін фактычна паўтарае ноту савецкага ўрада ўраду Польшчы, у якой было сказана, што ў сувязі з распадам польскай дзяржавы «спынілі сваё дзеянне дагаворы, якія былі заключаныя паміж СССР і Польшчай» [19, с. 96]. Прыведзены вышэй аналіз работ савецкіх гісторыкаў паказвае, што пры характарыстыцы працэсу ўключэння тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад савецкай дзяржавы яны кіраваліся канцэпцыяй гісторыі СССР, у аснове якай было палажэнне аб збіранні зямель вакол гістарычнай Расіі.

Такім чынам, савецкая гістарыяграфія ў 1939–1941 гг. не змагла сфармуляваць палажэнні, якія на грунце навуковай аб’ектыўнасці ахарактарызавалі б працэс уключэння Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад СССР. Фактычна яна выконвала задачы, сфармуляваныя ў рамках дзяржаўнай гістарычнай палітыкі. Гэта

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

патрабавала канцэнтрацыі намаганняў на абгрунтаванні і апраўданні той палітыкі, якую праводзіў СССР пасля падпісання савецка-германскага дагавора аб ненападзенні. У прыватнасці, для савецкіх гісторыкаў было важна знайсці як у падзеях канца жніўня – восені 1939 г., так і далёкім гістарычным мінулым аргументы, якія паказалі б неабходнасць і апраўданасць уключэння тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад СССР. Прычым пошук гэтых аргументаў вёўся ў рамках гістарычнай канцэпцыі, якая прыўзносіла гістарычную місію Расіі як збіральніцы зямель, на якіх затым была ўтворана савецкая шматнацыянальная саюзная дзяржава.

## Спіс крыніц і літаратуры


1. Пичета, В. Основные моменты развития Западной Украины и Западной Белоруссии / В. Пичета. – М. – Л. : Гос. соц.-эконом. издат., 1940. – 136 с.

2. Лочмель, И. Ф. Очерки истории борьбы белорусского народа против польских панов / И. Ф. Лочмель. – М. – Л. : Гос. издат. Отдел воен. лит., 1940. – 163 с.

3. Мязга, М. М. Гісторыя савецка-польскіх адносін міжваеннага часу ў работах І. Ф. Лочмеля / М. М. Мязга // Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы : матэрыялы III Міжнароднай навуковай канферэнцыі. Гомель, 30 верасня – 1 кастрычніка 2010 г. Рэд. калегія Р. Р. Лазько (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Гомель : УА "ГДУ ім. Ф. Скарыны", 2010. – С. 287–290.

4. Случ, С. З. Советско-германские отношения в ходе польской кампании и вопрос о вступлении СССР во вторую мировую войну / С. З. Случ // Славяноведение. – 1999. – № 6. – С. 32–43.

5. Абрамов, А. Западная Украина и Западная Беларусь / А. Абрамов, К. Венский. – Л. : Издат. Ленинградского городского совета депутатов, 1940. – 52 с.

6. Сяргеева, Г. Г. Гісторыя славянскіх народаў у працах беларускіх савецкіх даследчыкаў / Г. Г. Сяргеева, П. Ц. Петрыкаў, У. М. Міхнюк. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 36 с.

7. Даниленко, В. М. Ліквідація Польскої держави та встановлення радянского режиму в Західній Україні / В. П. Даниленко // Український історичний журнал. – 2006. – № 3. – С. 111–125.

8. Аксенова, Е. П. Очерки из истории отечественного славяноведения в 1930-е годы / Е. П. Аксенова. – М. : Институт славяноведения РАН, 2000. – 224 с.

9. Алаторцева, А. И. Журнал «Историк-марксист» 1926–1941 гг. / А. И. Алаторцева. – М. : «Наука», 1979. – 288 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

10. Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі. – Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1940. – 96 с.
11. Західна Україна: зборнік / Під рэдакциею С. М. Белоусова і О. П. Оглобліна. – Київ : Выдавніцтво Академіі наук УРСР, 1940. – 138 с.
12. Дубровский, А. М. Историк и власть: историческая наука СССР и концепция истории феодальной России в контексте политики и идеологии (1930–1950-е гг.) / А.М. Дубровский. – Брянск : Издательство Брянского государственного университета им. акад. И. Г. Петровского, 2005. – 800 с.
13. Пичета, В. Основные моменты в исторических судьбах народов Западной Украины и Западной Беларуси / В. Пичета // Историк-марксист. – 1939. – № 5–6 (75–76). – С. 67–68.
14. Мин, Д. Западная Украина / Д. Мин. – М. : Госполитиздат., 1939. – 48 с.
15. Петровський, М. І. Західна Україна. Історична довідка / М. І. Петровський. – Київ : Українське державне выдавництво, 1940. – 35 с.
16. Павлов, А. Крушение польского государства / А. Павлов // Партийное строительство. – 1939. – № 17–18. – С. 11–56.
17. Дашкевич, Ю. Единокровные братья / Ю. Дашкевич. – М. : Молодая гвардия, 1939. – 32 с.
18. Манусевич, А. Исторические предпосылки краха Польши / А. Манусевич // Исторический журнал. – 1939. – № 11. – С. 58–69.
19. Нота Правительства СССР, врученная послу Польши в СССР В. Гжибовскому 17 сентября 1939 г. // Документы внешней политики СССР : в 24 т. – М. : Издат. Политической литературы, 1977. – Т. 22, кн. 2. – С. 96.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

УДК 341.43«1939 »(438)(476)

**Д. М. Толочко**
*ГГУ им. Ф. Скорины, г. Гомель*

## ПАКТ МОЛОТОВА – РИББЕНТРОПА В ВОСПРИЯТИИ НАСЕЛЕНИЯ БССР

*В статье исследуется проблема восприятия населением БССР договора о ненападении между Германией и СССР. Автор приходит к выводу, что появление в советских средствах массовой информации известий о подписании*